# ДЫНАСТЫЧНАЯ ПАЛІТЫКА ЯГЕЛОНАЎ І ЗНЕШНЯЯ ПАЛІТЫКА ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА Ў КАНЦЫ XV – СЯРЭДЗІНЕ XVI СТ.

**МІКАЛАЕВА Л.В.**
КАНДЫДАТ ГІСТАРЫЧНЫХ НАВУК, ДАЦЭНТ
БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ ІНФАРМАТЫКІ І РАДЫЁЭЛЕКТРОНІКІ
Г. МІНСК, БЕЛАРУСЬ

У артыкуле разгледжана ўзаемасувязь дынастычнай палітыкі Ягелонаў і знешняй палітыкі Вялікага Княства Літоўскага ў канцы XV – сярэдзіне XVI ст. Робіцца выснова аб патэнцыяльнай жыццяздольнасці кааліцыі Ягелонскіх дзяржаў, якая спыніла існаванне з-за перарывання адной з галін дынастыі.

The article examined the relationship Jagiellonian dynastic politics and foreign policy of the Grand Duchy of Lithuania in the late XV - in the middle of the XVI. It is concluded that the potential viability of the coalition created Jagiellonian States, which ceased to exist due to interruption of one of the branches of the dynasty.

У межах любых дынастычных сістэм заўсёды выпрацоўваліся важнейшыя планы і мерапрыемствы адпаведнай палітыкі, накіраванай на захаванне і развіццё саміх дынастый, падтрымку іх легітымнасці. У ліку галоўных момантаў правільнай дынастычнай палітыкі ва ўсе часы заставаліся пытанні: па-першае, стварэння эфектыўнай сістэмы кіравання, пры якой асабістыя здольнасці манарха не мелі б рашаючага значэння для захавання дзяржаўнасці і дынастычнасці; па-другое, прадухілення выраджэння самой дынастыі шляхам кантролю над шлюбнай палітыкай правячага рода. На мяжы Сярэднявечча і Новага часу дынастычныя шлюбы манархаў Еўропы з’яўляліся яшчэ і адной з форм замацавання міждзяржаўных саюзаў, у сувязі з чым дынастычная палітыка часта аказвалася ўзаемазвязанай са знешняй палітыкай дзяржаў. Яшчэ адным варыянтам такой узаемасувязі былі спробы манархаў узводзіць прадстаўнікоў сваіх дынастый на троны іншых краін, легітымуючы іх уладу пагадненнямі з прадстаўнікамі мясцовай палітычнай эліты ці папярэднімі манархамі.

Звяртаючыся да рэалій нашага рэгіёна, трэба адзначыць, што адным з вынікаў больш чым паўвекавога панавання вялікага князя літоўскага [1440 – 1492] і караля польскага [1447 – 1492] Казіміра Ягелончыка (1427 – 1492) і яго дынастычнай палітыкі стала стварэнне Ягелонскай кааліцыі з ліку дзяржаў, дзе правілі яго сыны. Сам Казімір Ягайлавіч быў прадстаўніком другога пакалення дынастыі, што была заснавана яго бацькам вялікім князем літоўскім і каралём польскім Ягайлам Альгердавічам (1352? – 1434). Дынастыя Ягелонаў (Ягайлавічаў) была адной з малодшых, але найбольш узвысіўшыхся галін правячай у Вялікім Княстве Літоўскім (далей – ВКЛ)

Библиотека БГУИР

дынастыі Гедзімінавічаў. Магчыма, менавіта абставіны асабістага жыцця Ягайлы прадвызначылі тую пазіцыю, што заняў Казімір Ягайлавіч пры ажыццяўленні ўласнай дынастычнай палітыкі.

Казімір быў адзіным з пяці дзяцей Ягайлы, каму лёс наканаваў больш-менш працяглы жыццёвы шлях. Улічваючы фактар дзіцячай смяротнасці ў тую эпоху, будучае дынастыі залежала таксама і ад колькасці нашчадкаў манарха. Напэўна, не выпадкова ў Казіміра Ягайлавіча ад шлюбу з Эльжбетай Габсбург (1436 – 1505) было 13 дзяцей: 6 сыноў і 7 дачок. З іх да дарослага ўзросту дажыло 11 [1, с.385]. Кандыдатура жонкі Казіміра таксама была вельмі перспектыўнай, бо Эльжбета была дачкой Альбрэхта II Габсбурга (1397 – 1439), караля нямецкага, чэшскага і венгерскага, і Эльжбеты Люксембургскай (1409 – 1442). Такім чынам, яна з'яўлялася ўнучкай былога імператара Свяшчэннай Рымскай імперыі Сігізмунда I Люксембургскага (1368 – 1437) і пляменніцай дзеючага на той час імператара Свяшчэннай Рымскай імперыі Фрыдрыха III Габсбурга (1415 – 1493), законнай спадчынніцай венгерскай і чэшскай карон у выпадку смерці яе брата Уладзіслава Постума (1440 – 1457). Ініцыятыва заключэння гэтага шлюбу зыходзіла ад польскага ўрада, які пры гэтым у першую чаргу ставіў мэтай наладжванне добрых стасункаў са Свяшчэннай Рымскай імперыяй, што было надзвычай актуальным з прычыны пачатку ў тым жа 1454 г. вайны Польшчы з Тэўтонскім ордэнам.

Гэты шлюбны саюз, які задумваўся як звычайны дынастычны, верагодна, аказаўся ўсё ж шчаслівым. Па меншай меры крыніцы нічога не паведамляюць пра якія-небудзь пазашлюбныя прыгоды нашага манарха. Разам з тым, наяўнасць такой колькасці нашчадкаў вымагала ад Казіміра клопату аб забяспечанні іх будучага, не забываючы і пра пашырэнне ўласнага ўплыву.

Казімір пачаў ажыццяўляць сваю дынастычную палітыку неўзабаве пасля нараджэння ў 1456 г. свайго першынца, каралевіча Уладзіслава (1456 – 1516). Гэтаму ў пэўнай ступені спрыяла заканчэнне перыяду праўлення ў Чэхіі і Венгрыі прадстаўнікоў мясцовай арыстакратыі: Іржы з Падэбрад у Чэхіі [1457 – 1471] і Мацьяша Хуньядзі (Мацвея Корвіна) у Венгрыі [1458 – 1490]. Неўзабаве пасля абрання Іржы з Падэбрад каралём Чэхіі, прэтэндэнтам на які выступаў і Казімір Ягайлавіч, як муж роднай сястры апошняга чэшскага караля Уладзіслава Габсбурга, паміж канкурэнтамі была дасягнута дамоўленасць. Казімір прызнаваў Іржы каралём Чэхіі ў замен на абвяшчэнне спадкаемцам чэшскага трона свайго сына Уладзіслава. Іржы таксама паабяцаў Казіміру вайсковую дапамогу ў барацьбе супраць Ордэна, вайна з якім ішла ў той час. У выніку пасля смерці Іржы ў 1471 г. чэшскім каралем быў абраны старэйшы сын Казіміра Ягайлавіча пад імем Уладзіслава II [1471 – 1516] [2, с.90]. Так была ўзноўлена польска-чэшская дынастычная ўнія.

У тым жа годзе Казімір Ягайлавіч паспрабаваў забяспечыць за сваім другім па ўзросту сынам, каралевічам Казімірам (1458 – 1484), венгерскую карону, накіраваўшы супраць тагачаснага венгерскага караля Мацвея Корвіна сваё войска. Але польскае войска сваёй мэты не дасягнула. Толькі пасля

Библиотека БГУИР

смерці Мацвея Корвіна ў 1490 г. венгерская шляхта пажадала бачыць сваім каралём старэйшага сына Казіміра – чэшскага караля Уладзіслава, а заадно і ажаніць яго з удавой Корвіна – Беатрысай Неапалітанскай (1457 – 1508). Каб задаволіць апошняе патрабаванне сваіх будучых падданых Уладзіслаў нават заявіў аб разводзе са сваёй першай жонкай Барбарай (1464 – 1515), дачкой Альбрэхта Аркіля Гогенцолерна (1414 – 1486), курфюрста Брандэнбурга. У рэшце старэйшы сын Казіміра быў каранаваны ў Будзе пад імем Уласла II [1490 – 1516] [3, с.385].

Такім чынам, на момант смерці Казіміра ў 1492 г. блок дзяржаў Ягелонскай кааліцыі ахопліваў чатыры краіны: Венгрыю і Чэхію на чале з Уладзіславам Казіміравічам, Польшчу на чале з Янам Ольбрахтам (1459 – 1501) і ВКЛ на чале з Аляксандрам. Венгрыя і Чэхія былі злучаны персанальнай уніяй, астатнія – уніяй дынастычнай.

Аднак для таго, каб ператварыць кангламерат гэтых дзяржаў у жыццяздольны механізм узаемнага супрацоўніцтва на міжнароднай арэне, адных кроўных сувязей было недастаткова. Патрэбны былі палітычныя дамовы і хаця б аддаленае супадзенне інтарэсаў дзяржаў кааліцыі. Пры гэтым трэба зазначыць, што з першым патрабаваннем браты-Ягелоны больш-менш спраўляліся. Але салідарнасць Ягелонскіх дзяржаў канчаткова была замацавана ваенна-палітычнымі саюзамі толькі ў 1499 г. [4, p.451 – 452].

Наступныя гады сапраўды прынеслі некалькі прыкладаў гэтага супрацоўніцтва, перш за ўсё ў галіне дыпламатыі, падчас другой вайны Вялікага Княства Маскоўскага з ВКЛ (1500 – 1503 гг.). Тады ў 1501 і 1503 гг. у Маскву з’явіліся прадстаўнікі венгерскага і польскага каралёў, якія заклікалі да мірнага ўрэгулявання канфлікта, у праціўным выпадку пагражаючы ваеннай дапамогай уладару ВКЛ [5, с.300 – 307, 309 – 327, 341 – 361, 363 – 412]. Вынікам гэтых перамоваў было заключэнне шасцігадовага перамір’я. Такім чынам, у вобласці дыпламатычных кантактаў супрацоўніцтва Ягелонскіх дзяржаў прыносіла пэўныя вынікі, якім, аднак, складана даць адназначную ацэнку, паколькі, з аднаго боку, яны прыпынілі ваенны кафлікт, а з другога боку, не далі магчымасці пазбегнуць тэрытарыяльных страт.

У вобласці ваенных спраў усё выглядала значна горш. Тут існавала рэальнае супрацоўніцтва ВКЛ толькі з Польшчай і ў асноўным толькі пры абароне паўднёва-ўсходніх межаў абедзвюх дзяржаў, пры гэтым не заўсёды паспяховае [6, с.419]. На іншых флангах ваенная дапамога часам прыходзіла з Польшчы, хаця і не заўсёды. Так, падчас першай вайны Вялікага Княства Маскоўскага з ВКЛ (1492 – 1494 гг.) Польшча не аказала ВКЛ ваеннай дапамогі. Падчас другой вайны Вялікага Княства Маскоўскага з ВКЛ (1500 – 1503 гг.) яе ваеннная і фінансавая падтрымка таксама не была значнай. А той факт, што яна ўсё ж была аказана ў часы гэтага і пазнейшых канфліктаў, быў, хутчэй наступствам аб’яднання ВКЛ і Польшчы пад уладай аднаго манарха ў форме ўніі, якую польскі бок лічыў рэальнай, а ліцвінскі дамогся ператварэння яе на практыцы ў персанальную. Да таго ж за ўніяй з Польшчай, якая быццам бы павінна была павялічыць ваенна-палітычны

Библиотека БГУИР

патэнцыял ВКЛ, пастаянна крылася небяспека страты Княствам дзяржаўнай незалежнасці, паколькі, пачынаючы з 1501 г., польскі бок адной з умоў уніі выстаўляў інкарпарацыю Княства ў Карону [7, с.14 – 16]. Такім чынам, на гэтым флангу знешняй палітыкі дынастычная палітыка Ягелонаў уступала ў супярэчнасці з дзяржаўнымі інтарэсамі ВКЛ і нават прыводзіла да некаторага самаабмежавання Княства ў сферы знешняй палітыкі, бо ўнія яшчэ і легітымізавала падзел кампетэнцыі ў галіне дыпламатыі паміж Каронай і ВКЛ. У той час, як дыпламаты Каралеўства Польскга "спецыялізаваліся" пераважна на краінах Цэнтральнай і Заходняй Еўропы, сферай дзейнасці дымламатаў ВКЛ былі выключна краіны Усходняй Еўропы: Лівонія, Маскоўская дзяржава, Вялікая (Заволжская) Арда, Крымскае ханства і Малдавія (апошняя – толькі ў гады адсутнасці асабістай уніі паміж Польшай і ВКЛ (1492 – 1501 гг.). Адпаведна абедзве дзяржавы прадстаўлялі ў межах сваёй кампетэнцыі і палітычныя інтарэсы свайго партнёра спачатку па дынастычнай, а пазней і па персанальнай уніі [8, с.90 – 91].

Акрамя таго трэба прызнаць, што знешнепалітычныя інтарэсы Ягелонскіх дзяржаў не супадалі. Для Венгрыі прыярытэтнае значэнне мела абарона ад туркаў. Для Польшчы пункт цяжару перасунуўся ў пачатку XVI ст. з Прычарнамор'я на Балтыку. Для ВКЛ найбольш істотнай была канфрантацыя з Маскоўскай дзяржавай. Нарэшце Чэхія выразна ізалявалася ад пералічаных напрамкаў, не ўмешваючыся ў Ягелонскую палітыку [9, р.43]. Дадаткова справу ўскладнялі канфлікты паміж дзяржавамі кааліцыі, меўшыя асновай два спрэчныя пытанні: дзяржаўную прыналежнасць Малдаўскага княства і забеспячэнне самага малодшага з Ягелонаў – Жыгімонта Казіміравіча (1467 – 1548). У сваю чаргу, польска-малдаўскія канфлікты штурхалі Малдаўскае княства ў кола саюзнікаў Масквы, якая з'яўлялася галоўным знешнепалітычным праціўнікам ВКЛ. Часам даходзіла і да ваенных акцый Малдавіі на землі ВКЛ [10, с.90]. Тым самым ускладнялася знешнепалітычнае становішча ВКЛ. Такая сітуацыя існавала амаль на працягу ўсяго разглядаемага перыяду. Адносна другога пытання належыць прызнаць, што патрабаванне Уладзіслава, Яна Ольбрахта і каралевы-маці выдзеліць Жыгімонту ўдзел у ВКЛ, адхіленае кіраўніцтвам Княства, таксама закранала інтарэсы дзяржавы [11, с.101 – 106, 107].

Адносіны паміж братамі-ўладарамі крыху пагоршыліся пасля таго, як у 1501 г. вялікі князь Аляксандр перамог у барацьбе за польскую карону, прэтэндэнтам на якую быў і Уладзіслаў. Тады венгерскі бок прапанаваў Аляксандру выдзеліць для Жыгімонта Ягелона "каралеўскі ўдзел" ці ў ВКЛ, ці ў Мазовіі, ці ў Прусіі, на што атрымаў адмоўны адказ. Але ў гэтым выпадку можна бачыць спробу Уладзіслава звузіць сферу ўплыву Аляксандра за кошт адасаблення адной з пералічаных тэрыторый. Апошні таксама не адмаўляўся паслабіць удзельную вагу старэйшага брата, а разам з тым узмацніць свой уплыў у Цэнтральнай Еўропе. Вельмі паказальная ў гэтым сэнсе прадпрынятая ў 1505 г. спроба Аляксандра перадаць уладу над Чэхіяй з рук караля Уладзіслава ў рукі "губернатара" чэшскіх зямель, рэальнага яе правіцеля, якім павінен быў стаць той самы Жыгімонт

Библиотека БГУИР

Казіміравіч. Трэба адзначыць, што каралевіч Жыгімонт атрымаў падтрымку ад старэйшага брата Уладзіслава, які перадаў яму ў 1498 г. Глогаўскае, у 1501 г Апаўскае княствы, у 1504 г. прызначыў каралеўскім намеснікам Сілезіі, потым Лужыцы [12, p.569].

З узыходжаннем на троны ў Вільні і Кракаве Жыгімонта Казіміравіча [1506 – 1548], які актыўна ўключыўся ў барацьбу за павышэнне ўплыву Ягелонаў у Венгрыі, уступаючы ў канфрантацыю з Габсбургамі, дынастычная палітыка зноў уступіла ў супярэчнасці з дзяржаўнымі інтарэсамі ВКЛ, а таксама з пазіцыяй брата Уладзіслава, які праводзіў прагабсбургскую палітыку. У выніку імператар Максіміліян I Габсбург (1459 – 1519), які меў супярэчнасці з Жыгімонтам і па пытанню леннай залежнасці Тэўтонскага Ордэна ад Польшчы, заключыў у 1514 г. саюз з Маскоўскай дзяржавай, скіраваны супраць уладанняў Ягелонаў, і ў першую чаргу супраць ВКЛ [13, с.153]. Тым самым было сарвана пачаўшаеся наладжванне мірных перамоваў паміж Масковіяй і ВКЛ. Жыгімонт, які не чакаў такога павароту падзей, не здолеў своечасова аказаць дапамогу Смаленску, што быў захоплены ў гэтым жа годзе маскоўскім войскам.

Пераломнае значэнне для далейшага развіцця падзей меў Прэсбургска-Венскі кангрэс 1515 г. Гэта быў з’езд чатырох манархаў: каралёў венгерскіх і чэшскіх Уладзіслава II і яго сына Людовіка II (1506 – 1526), караля польскага і вялікага князя літоўскага Жыгімонта і імператара Максіміліяна I Габсбурга [1493 – 1519]. На гэтым з’ездзе быў дасягнуты кампраміс паміж пяццю краінамі і дзвюма дынастыямі, Габсбургамі і Ягелонамі. Выразам гэтага кампрамісу стаў Венскі трактат ад 20 і 22 ліпеня 1515 г. Для ВКЛ самае важнае значэнне мела тая яго частка, што фіксавала заключаную паміж Жыгімонтам і Максіміліянам I дамову аб міры і сяброўстве, і тым самым скасаванне саюза Габсбургаў з Масквой. Разам з тым шлюбныя дамовы паміж дзецьмі Уладзіслава II (ад трэцяга шлюбу з Ганнай дэ Фуа (1484 – 1506) і ўнукамі Максіміліяна I умацоўвалі спадчынныя правы Габсбургаў на венгерскі і чэшскі троны [14, p.624 – 630].

Гады пасля Венскага кангрэса 1515 г. былі перыядам супрацоўніцтва Ягелонаў з Габсбургамі, які цягнуўся да трагічных падзей 1526 г., калі ў бітве пад Мохачам (Могачам) загінуў малады Людовік II Ягелон [1516 – 1526], кароль Венгрыі і Чэхіі, не пакінуўшы спадчыннікаў. Тым самым быў адчынены шлях Габсбургам да венгерскага і чэшскага тронаў, якія пераходзілі эрцгерцага аўстрыйскага Фердынанда I Габсбурга (1503 – 1564), мужа Ганны (1503 – 1547), сястры Людовіка II, і брата яго ўдавы Марыі (1505 – 1558), будучага караля Германіі [1531 – 1562] і імператара Свяшчэннай Рымскай імперыі [1556 – 1564]. Жыгімонт Казіміравіч спрабаваў вылучыць сваю кандыдатуру на венгерскі трон, але безвынікова [15, p.647 – 648]. Ужыць сілу для падмацавання сваіх намаганняў ён не рашыўся.

Увогуле 1526 г. азначаў канец Ягелонскай кааліцыі. Тое, што канец гэты наступіў вельмі хутка і амаль без барацьбы, можа служыць доказам сцвярджэння, што блок Ягелонскіх дзяржаў быў досыць штучным і выпадковым механізмам, які не вытрымаў пробу часам і аказаўся эпізодам у

Библиотека БГУИР

гісторыі Чэхіі і Венгрыі. Затое ён адыграў важную ролю ў гісторыі ВКЛ і Польшчы. Цікава, што разрыў у блоку адбыўся не ў тым месцы, дзе былі найвялікшыя адрозненні паміж краінамі, гэта значыць паміж блокам трох краін: Венгрыі, Чэхіі і Польшчы, – і ВКЛ. Першыя тры былі саслоўнымі манархіямі і з гэтага пункта гледжання адрозніваліся ад ВКЛ, абмежаванай спадчыннай манархіі з алігархічна-арыстакратычным ладам. З пункта гледжання культуры першыя тры дзяржавы належалі да заходняй рымскай цывілізацыі, у той час як па тэрыторыі ВКЛ праходзіў падзел паміж заходняй рымскай і ўсходняй візантыйскай цывілізацыямі. Да таго ж Польшчу, Венгрыю і Чэхію звязвалі агульныя інтарэсы барацьбы з турэцкай экспансіяй і германскай агрэсіяй. Факты гэтыя падштурхоўваюць да думкі, што, напэўна, усё ж існавала магчымасць згладжвання вялікіх адрозненняў паміж краінамі, і што блок Ягелонскіх дзяржаў не быў з самага пачатку асуджаны на няўдачу.

Можна таксама дадаць, што каралева польская і вялікая княгіня літоўская Бона Сфорца (1494 – 1557) ў пазнейшы перыяд спрабавала працягваць старую дынастычную палітыку Ягелонаў у Венгрыі. Гэта знайшло выраз у шлюбе яе дачкі Ізабелы (1519 – 1559) з венгерскім каралём Янам Запольяі (1487 – 1540), ворагам Габсбургаў [16, p.661 – 662, 674]. Ад гэтага шлюбу нарадзіўся сын Ян Зыгмунт Запольяі, які стаў спадчыннікам венгерскага трону. Памёр ён без нашчадкаў ў 1571 г. Панаваўшы тады ў Польшчы [1548 – 1572] і ВКЛ [фармальна з 1529, фактычна 1544 – 1572] яго дзядзька Жыгімонт Аўгуст (1520 – 1572) даўно адмовіўся ад правядзення актыўнай венгерскай палітыкі [17, p.681]. А з яго смерцю ў 1572 г. спынілася і Ягелонская дынастыя. Прыйшоў канец Ягелонскай Еўропы.

## Спіс выкарыстаных крыніц


1. Герберштейн С. Записки о Московии / Пер. с нем. А. И. Малеина и А. В. Назаренко, вступ. статья А. Л. Хорошкевич, под ред. В. Л. Янина. – М.: Изд-во МГУ, 1988. – 430 с.
2. Хроника Литовская и Жмойтская /АН СССР, Ин-т истории. – М.: Наука, 1975. – Т. 32. – С. 85 – 109.
3. Герберштейн С. Записки о Московии / Пер. с нем. А. И. Малеина и А. В. Назаренко, вступ. статья А. Л. Хорошкевич, под ред. В. Л. Янина. – М.: Изд-во МГУ, 1988.
4. Halecki, O. Dzieje Unii Jagiellonskiej/ O. Halecki. – Kraków: Akademia Umiejętnosci, 1919. – T. 1. – 482 p.
5. Памятники дипломатических сношений Московского государства с Польско-Литовским. – Т. 1: 1487 – 1533/ Под ред. Г.Ф. Карпова // Сборник Императорского Русского Исторического Общества. – СПб.: Тип-я Ф. Елеонского, 1882. – Т. 35. – VI, 869, XII с.
6. Kolankowski, L. Dzieje Wielkiego księstwa Litewskiego za Jagiellonów/ L. Kolankowski. – Warszawa: Scład głowny: kasa im. Mianowskiego, 1930. – T. 1. – 475 p.


Библиотека БГУИР

7. Halecki, O. Dzieje Unii Jagiellonskiej/ O. Halecki. – Kraków: Akademia Umiejętnosci, 1919. – T. 1.
8. Дзярновіч, А. Метрыка ВКЛ аб адносінах Вялікага княства Літоўскага і Святой Рымскай імперыі/ А. Дзярновіч // Беларускі гістарычны часопіс. – 1995. – №4. – С. 90 – 99.
9. Błaszczyk, G. Litwa na przełome średniowiecza i nowozytności: 1492-1569/ G. Błaszczyk. – Poznań: Wydawnictwo Poznańskie, 2002. – 336 p.
10. Литовская метрика = Lietuvos metrika/ Ин-т истории Литвы. – Вильнюс: Mokslo ir ehciklopediju leidykla, 1993. – Кн. 5: Книга записей (1427 – 1506)/ Подгот. Э. Банионис. – 1993. – 402 с., 4 л. факс.
11. Там жа.
12. Historia dypłomacji Polskiej (połowa X – XX w.): W 5 t. / Polski Institut Spraw Międzynarodowych; pod red. G. Łabudy. – Warszawa: PWN, 1982. – T. 1: połowa X w. – 1572/ M. Biskup, K. Gorski, Z. Kaczmarczyk, G. Łabuda, Z. N. Nowak, K. Zelewski. Pod red. M. Biskupa. – 875 p.
13. Опись архива Посольского приказа 1626 года/ Подгот. к печ. В.И. Гальцов; под ред. С.О. Шмидта. – М.: ЦГАДА, 1977. – Ч. 1. – 416 с.
14. Historia dypłomacji Polskiej (połowa X – XX w.): W 5 t. / Polski Institut Spraw Międzynarodowych; pod red. G. Łabudy. – Warszawa: PWN, 1982. – T. 1: połowa X w. – 1572/ M. Biskup, K. Gorski, Z. Kaczmarczyk, G. Łabuda, Z. N. Nowak, K. Zelewski. Pod red. M. Biskupa.
15. Там жа.
16. Там жа.
17. Там жа.

Библиотека БГУИР